

ДУК "Свіслацкая раённая бібліятэка"

Аддзел маркетынгу,сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы

# КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР

## знамянальных і памятных дат на 2025 год

Свіслач, 2025

Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год / аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы ДУК “Свіслацкая раённая бібліятэка”; складальнік А.У. Рабчанка; рэдактар Н.У.Калач. – Свіслач, 2025

*У распаўсюджванні гістарычных звестак аб тым ці іншым краі, людзях, якія яго праславілі, гарадах і вёсках, установах культуры і адукацыі важная роля належыць календарам знамянальных і памятных дат. Яны ўваходзяць у склад краязнаўчых рэкамендацыйных дапаможнікаў і прызначаны бібліятэчным работнікам у дапамогу іх шматграннай краязнаўчай дзейнасці, работнікам сродкаў масавай інфармацыі і музеяў, якія займаюцца распаўсюджваннем краязнаўчых ведаў, а таксама усім, каго цікавіць гісторыя і сучаснасць роднага края.*

*У інфармацыйнае выданне "Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат горада Свіслач і Свіслацкага раёна на 2025 год" уключаны найбольш значныя даты з гісторыі, эканамічнага і культурнага жыцця Свіслаччыны, а таксама юбілейныя даты знакамітых ураджэнцаў і дзеячаў, якія пакінулі след у гісторыі нашага краю. Усе матэрыялы прыводзяцца ў парадку прамой храналогіі, сістэматызаваны па каляндарным прынцыпе са студзеня па снежань, у межах кожнага месяца – па чыслах. Падзеі, храналогія якіх устаноўлена толькі ў межах года, знаходзіцца ў пачатку календара.*

*Свіслацкая раённая бібліятэка з удзячнасцю прыме заўвагі, прапановы і дапаўненні да дадзенага выдання па адрасе: г.Свіслач, вул.Першамайская, д.4;*

*e-mail: lib@kultura-svisloch.by;*

*тэлефон 70074.*

# У 2025 годзе спаўняецца:

## 1235 г. – 790 гадоў з часу першага упамінання пра Свіслач

Як мяркуецца, назва Свіслач мае яцвяжскага паходжання і азначае балота, багністае месца, волкасць. Па іншай версіі, назву Свіслач звязана з ракой Вісла (Рэспубліка Польшча). Менавіта адтуль (з Віслы) рухаліся славянскія плямёны на ўсход і засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі. Трэцяя версія – назва паселішча ўтварылася ад назвы ракі Свіслач. Гісторыкам Свіслач вядомая з сярэдзіны XIII стагоддзя, калі нароўні з Гродзенскім, Навагрудскага, Ваўкавыскага існавала і Свіслацкае ўдзельнае княства на чале з князем Ізяславам. Князь Ізяслаў Ізяслававіч быў пераведзены з Навагрудка ў Свіслач. Утварылася Свіслацкае княства ў Чорнай Русі. Першая згадка пра паселішча сустракаецца ў Іпацьеўскім летапісе і датуецца 1256 годам.



## 1460 г. – 565 гадоў назад у мястэчку Поразава пад кіраўніцтвам Яна Рымандабыў пабудаваны касцёл св.Пятра і Паўла, які стаў заснаваннем каталічнай парафіі ў Поразава

Мясцовасць Поразава, што ляжыць над ракой Поразаўкай, прытокам Росі, мае багатую і велічную гісторыю. Мястэчка ўпершыню згадваецца ў 1460 г., калі судовы стараста лідскі і брэсцкі Ян Рымвід заклаў тут драўляны касцёл. 29 чэрвеня 1460 г. той жа Рымвід надаў храму фундацыю з чатырох падданых у вёсцы Рушчыцы пад Слонімам, палі каля плябаніі, лугі за Поразавам і зерневую дзесяціну з мястэчка. Першы касцёл з 1460 г. уяўляў сабою драўлянае збудаванне і атрымаў назву ў гонар Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі. З вялікай верагоднасцю магчыма меркаваць, што асвяціў яго кіраўнік віленскай дыяцэзіі Мікалай Дзергавіч, у часы біскупства якога (1453-1467) і быў пабудаваны храм. У 1522 г. прэлат Ян Альбінус зрабіў апісанне касцёлаў і кляштараў Віленскай дыяцэзіі, у тым ліку і поразаўскага касцёла. На жаль, матэрыялы Альбінуса былі знішчаны ў час шматлікіх пажараў і войнаў і вядомы сучасным даследчыкам толькі праз ускосныя сведчанні пазнейшых гісторыкаў.

## 1505 г. – 520 гадоў назад Новы Двор атрымаў статус мястэчка

У 1392 годзе Вялікі князь Літоўскі аблюбаваў Белавежскую пушчу, дзе заснаваў паляўнічую рэзідэнцыю, якую назваў Новым Дваром. Так з'явілася ў Белавежы новае пасяленне, якое ўпершыню згадваецца ў 1409 г. Дзякуючы зручнаму геаграфічнаму становішчу, хутка пачало развівацца і само пасяленне Новы Двор. У Навадворскай царкве мелася кніга-летапіс, у якой




расказвалася наступнае: "У далёкія часы на месцы в. Новы Двор быў невялікі пасёлак. Лясы Белавежскай пушчы былі асабістай уласнасцю польскіх каралёў. І вось аднойчы польская каралева (забыў яе імя) аб'язджала свае ўладанні, заехала ў пасёлак і запытала ў жыхароў, як яны яго называюць. Сяляне называлі сваё паселішча Залесна. Каралева заўважыла, што гэта назва не падыходзіць. Трэба назваць яго па іншаму, так як тут пабудаваны новыя дамы. І прапанавала назваць яго Новым Дваром". Новы Двор хутка рос. З маленькай вёскі ён ператварыўся ў вялікае пасяленне. У 1505 г. ён атрымаў статус мястэчка. Як важны населены пункт Новы Двор фігуруе на карце Вялікага княства Літоўскага ўжо ў 1507 г.

## 1615 г. – 500 гадоў назад кароль Жыгімонт I падцвярджае магдэбургскае права м.Поразава

Па пісьмовых крыніцах Поразава вядома з XV ст. як каралеўскае мястэчка ў Ваўкавыскім павеце Навагародскага ваяводства Вялікага Княства



Літоўскага. У 1523 г. кароль Жыгімонт I (1506–1548) надаў мястэчку магдэбургскае права, у 1615 г. – пацвярджае магдэбургскае права, у 1616 г. Поразава атрымала адзін з атрыбутаў гарадскога самакіравання – герб. На працягу XVII-XVIII стст. гарадскія вольнасці не раз пацвярджаліся граматамі вярхоўнай улады. На архіўных дакументах гэтага перыяду зафіксаваны гарадскія пячаткі, датаваныя 1616 і 1720 гг. На іх выразна бачны постаці Дзевы Марыі і немаўля Ісуса. Менавіта гэтыя пячаткі паслужылі асновай для аднаўлення гістарычнага герба гарадскога пасёлка Поразава.

## 1690 г. – 335 гадоў назад першае вядомае ўпамінанне в.Пацуі




Вёска Пацуі вядома з пачатку XVI стагоддзя. У 1506 г. гэта быў маёнтак, шляхецкае ўладанне, якое ўваходзіла ў склад Ваўкавыскага павета Вялікага Княства Літоўскага. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у 1795 годзе Пацуі ўваходзяць у склад Расійскай імперыі Ваўкавыскага павета Слонімскай, з 1797 года Літоўскай, а з 1801 года Гродзенскай губерняў. Уладальнікам яе быў Пац Хрыстафор. Мабыць, ад яго прозвішча і ўзнікла назва вёскі.

## 1720 г. – 305 гадоў назад выраблена пячатка м.Поразава, на якой была выява Маці Божай з дзіцём на руках



У фондах Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея знойдзены сургучны адбітак пячаткі органаў гарадскога самакіравання Поразава. На пячатцы – выява Маці Божай з дзіцём на руках. Па колу пячаткі надпіс: +PIECZENC MIASTA POROZOWA ONNO 1720 (+ПЯЧАТКА МЕСТА ПОРАЗАВА ГОДУ 1720).

## 1730 г. – 295 гадоў назад першае ўпамінанне пра фальварак Вердамічы

Вядома вёска з 16 стагоддзя. Упершыню ўзгадваецца як маёнтак у Ваўкавыскім павеце Навагрудскага ваяводства ВКЛ. У 1567 годзе А.Трызна са сваіх маёнткаў Палонкі, “з Видомичь”, Свянціцы ставіў у войска ВКЛ 5 коней. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай (1795) вёска знаходзілася ў Расійскай імперыі, у Ваўкавыскім павеце Слонімскай, з 1797 года Літоўскай, з 1801 года Гродзенскай губерняў. Назва вёскі Вердамічы, як сцвярджае В.А.Жучкевіч, патранамічная, вытворная ад балцкай асновы, відаць ад спадчыннага фінскага vavda (vavdavitas) – шаптун, знахар, загаворшчык.



## *1735 г. – 290 гадоў назад першае ўпамінанне пра в.Вялікае Сяло*




Вёска Вялікае Сяло (ці Вялікая Весь) вядома з 1-й паловы XVIII стагоддзя. У той час вёска адносілася да маёнтка Вялікая Свянціца, уладанне памешчыка Ігната Францавіча Калупайлы. Вялікае Сяло (Вялікая Весь) была пабудавана ў адну доўгую вуліцу, якая цягнулася аж да лесу. Адсюль і пайшла назва Вялікае Сяло (Вялікая Весь).

## *1750 г. – 275 гадоў з дня нараджэння Чыпрыяні Карм'е, італьянскага кампазітара, скрыпача*

Каля 1770 г. перасяліўся ў Польшчу. Аўтар папулярных канцэртаў для скрыпкі, з якімі выступаў у Гданьску, Варшаве, Рызе (1770 г.), у Санкт-пецярбургу (1774 г.). У 1775-1776 гг. быў капельмайстрам і кампазітарам у Ружанскім тэатры Сапегаў. З 1776 па 1778 г. Чыпрыяні працаваў салістам Слонімскай капэлы Агінскага. Затым пераехаў у Свіслач, дзе кіраваў прыгоннай капэлай тэатра Вінцэнта Тышкевіча, быў прыдворным кампазітарам графа. Творы Чыпрыяні знаходзіліся ў нотнай бібліятэцы Тышкевіча. Са Свіслачы ён пераехаў у Варшаву, дзе і памёр у 1789 г.

## *1790 г. – 235 гадоў назад пабудавана царква ў в.Харашэвічы*

Царква пабудавана памешчыкам Харашэвічам Якімам Мікалаевічам Булгарыным на яго ўласныя сродкі ў 70-х гадах XVIII стагоддзя. Як запісаў у 1880 годзе настаяцель храма Пётр Праабражэнскі: “Будынак царквы мураваны з чарапічным дахам. Унутраная плошча храма роўная 54 кв. сажням, без скляпенняў і атынкавана. Столь драўляная і абтынкованая; печаў няма; усходніх кліграсаў няма. Прастол адзін, да 1856 года ў гонар Святой Тройцы, а з 1856-га – у гонар Пакровы Прасвятой Багародзіцы; алтар без падзелаў умяшчальнасцю 22 кв. сажняў. Іканастас драўляны прамы, цяслярскай працы, без разьбы і ў адзін ярус. Царскія дзверы драўляныя, у верхняй палове рашэцістыя і без асаблівых малюнкаў”. Помнік архітэктуры позняга клаіцызму. Вырашана прамавугольным у плане аб'ёмам, які ўступам пераходзіць у паўкруглую апсіду з бакавой нізкай рызніцай. Да фасада дабудавана



трохярусная чатырохгранная званіца, завершаная макаўкай. Другі ярус вырашаны чатырохкалонным порцікам з трохвугольным франтонам. Макаўкай завершаны і двухсхільны дах над алтарнай часткай. Фасады падзелены арачнымі аконнымі праёмамі. Царква ў імя Святой праведнай Ганны.

## *1805 г. – 220 гадоў таму пачала дзейнічаць знакамітая Свіслацкая гімназія*



Паводле пісьмовых крыніц, гімназія ў Свіслачы была заснавана па ініцыятыве дырэктара вучылішчаў Гродзенскай губерні Ю. Касакоўскага на сродкі ўладальніка горада графа Вінцэнта Тышкевіча. Свіслацкая гімназія мела статус губернскай, у ёй маглі вучыцца маладыя людзі з Брэсцкага, Пружанскага, Кобрынскага, Валкоўскага, Слонімскага і Гродзенскага паветаў. У гімназіі былі створаны вялікая бібліятэка і фізічны кабінет. У 1808 г. у бібліятэцы было 889 тамоў рознай літаратуры, з іх 550 кніг з уласнага збору графа Тышкевіча. Вялікі і прыгожы будынак гімназіі, выкананы ў стылі ампір, быў пабудаваны ў 1802-1803 гг. па праекце архітэктара Яна Шантара. Ён быў аднапавярховым, са складанай аб’ёмна-прасторавай кампазіцыяй. Галоўны фасад быў вылучаны ў цэнтры дзесяцікалонным порцікам тасканскага ордара, завершаным вялікім прамавугольным атыкам. Фасады флігеляў былі апраўлены шасцікалоннымі порцікамі, аналагічнымі цэнтральнаму. Сіметрычнае размяшчэнне порцікаў стварала стылістычнае адзінства і лагічную завершанасць кампазіцыі будынка. Прамавугольныя аконныя праёмы былі ўпрыгожаны ляпнінай, фасады з порцікамі абагачаны сандрыкамі. У 1815 г., пасля смерці Тышкевіча, атрыманне адпісаных ім грошай дазволіла кіраўніцтву гімназіі рэфармаваць яе ўнутранае жыццё, пашырыць колькасць падданых і настаўнікаў. У 1817 г. дзейнічалі падрыхтоўчыя і 6 асноўных класаў. У гімназіі выкладалі многія вядомыя навукоўцы і педагогі. Сярод іх варта адзначыць прафесара фізікі Яна Вольскага, настаўніка грэцкай мовы і літаратуры Льва Бароўскага (1807-1811). У розны час вучнямі гімназіі былі такія вядомыя людзі, як пісьменнік Ю.Крашэўскі, кампазітар і мастак Н.Орда. У 1828 г. Свіслацкая гімназія страціла статус губернскай гімназіі. У Свіслачы захавалася павятовая гімназія, якую меркавалася перавесці ў Слонім, і тут пакінуць толькі 5-класнае павятовае вучылішча для дваран. У 1845 г. гімназію перавялі ў Шаўлі Ковенскай губерні. У 1860 г. была зроблена спроба аднавіць гімназічную адукацыю ў горадзе, стварыўшы на базе мясцовага павятовага



вучылішча 4-класную прагімназію. Гімназія ў Свіслачы была зачынена пастановай урада ад 15.06.1865 г. Будынак гімназіі захаваўся часткова. Былая гімназія – прамавугольны аднапавярховы будынак пакрыты двухсхільным дахам. Заходні кантавы фасад упрыгожаны каланадай дарычнага ордара з двух'ярусным атыкам. Мансардныя ярусы завершаны развітымі карнізамі. Фасад, які адпавядае калонам, усеяны пілястрамі, працятымі прамавугольнымі аконнымі праёмамі з трохвугольнымі сандрыкамі. Два ўваходы на бакавым фасадзе вылучаюцца порцікамі з двума парамі квадратных калон. Порцікі завяршаюцца трохкутнымі франтонамі. Фасады падзелены аконнымі праёмамі прамавугольнай формы без молдынгаў, аздобленымі прафіляванымі карнізамі. Унутраная планіроўка і дэкор інтэр'еру не захаваліся.

## *1825 г. – 200 гадоў таму пачалося будаўніцтва касцёла ў м.Поразава*

Будаўніцтва працягвалася тры гады. Помнік архітэктуры класіцызму. Пабудаваны з цэглы і бутавага каменю. Прамавугольны ў плане будынак накрыты двухсхільным дахам. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам з галоўкай. Сцены складзены з абчасанага каменю. Пілястры на фасадах, прамавугольныя абрамленні аконных праёмаў, фрыз, карніз і франтон галоўнага фасаду цагляныя, атынкаваныя. Інтэр'ер



зальны, столь плоская, драўляная. Уздоўж заходняй сцяны – хоры. Разныя алтары, кафедра, паліхромная драўляная скульптура 19 ст. – характэрныя ўзоры народнага манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. У падрамнай званіцы адліты ў 1749 звон з сюжэтнай гравіроўкай.

## *1895 г. – 130 гадоў з дня нараджэння ветэрана вайны, генерала Івана Кудэлькі*



Іван Міхайлавіч Кудэлька нарадзіўся ў Дрэчанах у сям'і беззямельнага селяніна. Тут пачаў сваю працоўную дзейнасць: пасвіў хатніх жывёлаў, працаваў у паноў Ражноўскага і Снарскога. Працаваў лесарубам у Белавежскай пушчы, бетоншчыкам у Брэсцкай крэпасці, на чыгуначным перагоне паміж Свіслачу і Нараўкай. У 1916 г. прызваны ў царскую армію, у сібірскі стралковы полк. Ваяваў супраць кайзераўскай Германіі, удзельнічаў у Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У 1918 г. уступае дабравольцам у камсамольска-маладзёжны атрад Чырвонай гвардыі. За смеласць і

адвагу ўзнагароджаны баявой памятнай зброяй. У 1923 г. накіроўваюць у Маскву на вучобу у рабфак. Праз два гады вучыцца ў Маскоўскім інстытуце інжынераў транспарту, пасля заканчэння якога накіроўваецца для ўзмацнення каманднага саставу на будаўніцтва чыгуначнай магістралі “Турксіб” працягласцю 1500 кіламетраў: ад Сяміпалацінска да Алма-Аты. Магістраль была здадзена ў эксплуатацыю праз 40 месяцаў, на 17 раней за тэрмін. Пасля гэтага Івана Міхайлавіча перавялі на будаўніцтва двухшляховай 1500-кіламетровай магістралі Масква-Данбас. Іван Кудэка з’яўляецца галоўным інжынерам усёй магістралі. За ўкараненне першага ў СССР пуцеўкладчыка Івана Міхайлавіча, як кіраўніка будоўлі, у 1939 г. узнагародзілі ордэнам Леніна. У пачатку 40-х назначаны начальнікам будкіравання №75 Міністэрства шляхоў зносін па будаўніцтве абаронных умацаванняў Ленінграда. Падчас вайны стройупраўленне №75 будавала вакол горада доты, іншыя баявыя кропкі, супрацьтанкавыя равы. У 1943 г. чыгуначнікі пабудавалі 36-кіламетровую стальную магістраль, якая была працягнута ў саракаградусныя маразы за 14 сутак, і мост праз Няву. У пасляваенны час Іван Міхайлавіч будаваў Ленінградскі метрапалітэн. Наш славуты зямляк узнагароджаны шматлікімі ордэнамі, медалямі і знакамі пашаны. Працоўны подзвіг чыгуначнікаў залатымі літарамі ўпісаны ў мармуровую сцяну манумента Перамогі ў гонар абаронцаў Ленінграда.



### *1940 г. – 85 гадоў з часу адкрыцця кінатэатра ў будынку сінагогі*

### *1955 г. – 70 гадоў з часу адкрыцця новага раённага Дома культуры ў Свіслачы*



### *1960 г. – 65 гадоў з часу аб’яднання Поразаўскага і Свіслацкага раёнаў у адзін Свіслацкі*

## *1960 г. – 65 гадоў з часу устанаўлення абеліска на месцы расстрэлу свіслацкіх яўрэяў ва ўрочышчы Вішаўнік*

Знаходзіцца за 2 км на захад ад г.Свіслач. Тут пахавана 1536 жыхароў Свіслачы і іншых населеных пунктаў. 2 лістапада 1942 года нямецка-фашысцкія захопнікі сагналі ў лес мірных жыхароў, загадалі выкапаць яму, затым дарослых расстралялі. Дзяцей забівалі палкамі і прыкладамі. У 1960 годзе на магіле устаноўлены помнік. У 2018 г. устаноўлены новы помнік.







## *1990 г. – 35 гадоў назад з'явілася новая вуліца ў Свіслачы – імя Ф.Скарыны.*

## *2000 г. – 25 гадоў народнаму ансамблю народнай песні і музыкі «Пушчанскія напевы» Пацуеўскага сектара культуры і вольнага часу.*

Калектыў быў створаны творчымі работнікамі Пацуеўскага СДК, якім загадвала Святлана Аніська. Сваю творчую дзейнасць пачаў пад кіраўніцтвам Святланы Лукашэвіч. А вось назвай ансамбль абавязаны былому вядучаму метадысту РМЦ Аліне Адашчык. Гэта яна падчас падрыхтоўкі калектыву да значымай падзеі – атрымання звання народнага – акрысціла да гэтага безыменную вакальную групу "Пушчанскімі



напевамі”. Аліна Іванаўна стала і аўтарам вершаваных радкоў, якія пралогам ляглі ў канцэртную праграму, з якой і выйшлі артысты да суддзяў. Так трапна звязаліся ў чатырохрадкоўе словы, так лёгка ляглі на слых і душу, што іх па сёння пераказваюць па памяці ў сценах пацуеўскай клубнай установы: «Заслухаюцца ніва, поле, сенажаць, калі гучаць дзяўчат жывыя спевы... Дай, Божа, голасу! Што тут яшчэ сказаць?! Няхай гучаць “Пушчанскія напевы”!» Спраўдзілася! За дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай творчасці, папулярызацыю нацыянальных культурных традыцый, высокі мастацкі ўзровень, актыўную канцэртную дзейнасць у лютым 2008-га ансамблю было прысвоена званне народнага. На працягу дваццаці гадоў склад выканаўцаў мяняўся. Адны артысты пакідалі калектыў, другія – уліваліся. Усе – асобы творчыя, энергічныя і ініцыятыўныя. Асноўнай мэтай дзейнасці калектыву з’яўляецца папулярызацыя народнай і аўтарскай песні. Ансамбль пастаянна папаўняе і абнаўляе рэпертуар, пашырае геаграфію выступленняў (нязменны ўдзельнік раённых, абласных мерапрыемстваў, аглядаў-конкурсаў, фестываляў і святаў), імкнецца да самаўдасканальвання, вяршыні выканаўчага ўзроўню, шукае цікавыя сцэнічныя рашэнні ў пастаноўцы нумароў. За гады дзейнасці ансамбль заваяваў сабе заслужаны аўтарытэт, прызнанне прафесіяналаў і любоў прыхільнікаў народнай песні. Калектыў прымае ўдзел у шматлікіх мерапрыемствах, атрымлівае шматлікія ўзнагароды. На рэгіянальным свяцe-конкурсе вакальна-харавога мастацтва “Пеўчае поле” узнагароджаны дыпломам III ступені. На рэгіянальным свяце “Свіслацкі кірмаш” – дыпломам за захаванне нацыянальных традыцый. За ўдзел у фестывалі народнай творчасці “Агні зімы” маюць дыплом ад беларускага Дзеда Мароза. Адзначаліся на фестывалі жывой музыкі “Поразаўскія сустрэчы”, на Міжнародным этнафестывалі “Музыка нашых сэрцаў” у Карэвічах, на Дні беларускага пісьменства і шмат іншых.

## СТУДЗЕНЬ

### 15 (1940) – 85 гадоў з часу ўтварэння Свіслацкага раёна

15 студзеня 1940 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР створаны Свіслацкі раён у складзе Беластоцкай вобласці. Тэрыторыя складае 1809 км.кв. Максімальня адлега паміж граніцамі раёна з поўначы на поўдзень 36 км., з захаду на ўсход 33 км. Насельніцтва раёна – 46065 чал., Свіслачы – 5216 чал. Населеных пунктаў – 300. У раёне арганізавана 10 калгасаў, 1 МТС і 1 заатэхнічная станцыя. Прамысловасць: 1 скурзавод, 3 цагляных завода, 4 скіпідарных завода, 5 лесапільных заводаў, 2 крахмальных і 1 вінакураны, 9 параматорных млыноў і 12 вадзяных, электрастанцыя і часальня воўны. Налічваецца 62 школы. 12 кастрычніка 1940 года – раён падзелены на 16 сельсаветаў (іх колькасць, назвы і граніцы ў 1945–2014 гады неаднаразова змяняліся). 26 ліпеня 1941 года – нямецка-фашысцкія войскі ўвайшлі ў Свіслач і ўсталявалі жорсткі акупацыйны рэжым. 17 ліпеня 1944 года – Свіслач

вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. 20 верасня 1944 года – Свіслацкі раён увайшоў у склад Гродзенскай вобласці. 20 кастрычніка 1995 года – у адну адміністрацыйную адзінку аб'яднаны г.п. Свіслач і Свіслацкі раён. У 1998 годзе г.п. Свіслач быў прызнаны лепшым у абласным і рэспубліканскім аглядзе-конкурсе сярод малых гарадоў Рэспублікі Беларусь. 14 снежня 2000 года Свіслач атрымала статус горада раённага падпарадкавання. 14 ліпеня 2007 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 279 зацверджаны геральдычныя сімвалы г. Свіслач і г.п. Поразава – герб і сцяг.

## ЛЮТЫ

### 4 (1920) – 105 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Барысавіча Сасноўскага, ганаровага грамадзяніна г.Свіслач



Нарадзіўся на Смаленшчыне. Пасля педвучылішча працаваў у сельскай школе. Вызваляў Беларус ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Працаваў першым сакратаром Гродзенскага абкома камсамола, сакратаром Гродзенскага гаркома партыі, першым сакратаром Свіслацкага райкома партыі (1958-1962). Не парываў сваёй сувязі са Свіслацкім краем і ў наступныя гады, працуючы з 1962 па 1983 г. намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкома. З 1984 г. узначальваў абласны савет ветэранаў вайны і працы. Мае ўзнагароды ордэны Айчыннай вайны I і II ступеняў, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, "Знак Пашаны" (тройчы), восем медалёў.

### 17 (1900) – 125 гадоў з дня нараджэння Мікалая Трафімавіча Селяха, генерал-маёра, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны



Нарадзіўся ў в.Грыцкі ў сям'і чыгуначніка. Член КПСС з 1920 г. Закончыў вышэйшую артылерыйскую школу (1922 г.), ваенную акадэмію імя Фрунзе (1930 г.). У Чырвонай Арміі з 1919 г. на Петраградскім і Заходнім франтах. Удзельнік баёў у Полацку, Лепелі, Гомелі, радавы, начальнік вучэбнай каманды. З чэрвеня 1941 года на Паўднёвым і Паўночна-Каўказскім франтах. У 1942 г. прысвоена званне генерал-маёра артылерыі. Начальнік упраўлення супрацьпаветранай абароны. Удзельнік баёў пад Растовам, Сталінградскай бітвы, вызвалення Беларусі.

У ходзе Берлінскай аперацыі ўдзельнічаў у вырашэнні пытанняў узаемадзеяння сістэмы супрацьпаветранай абароны войскаў і СПА краіны. Пасля вайны працаваў у цэнтральным апараце Міністэрства абароны. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр 8 сакавіка 1954 года.



***17 (2010) – 15 гадоў назад у рамках рэалізацыі рэспубліканскай праграмы "Чыстая вада" была запушчана станцыя абезжалезвання***

## САКАВІК

### *8 (1935) – 90 гадоў з дня нараджэння Івана Іванавіча Дзесяціка, кандыдата біялагічных навук*

Нарадзіўся ў Свіслачы. У 1954 г.скончыў мясцовую сярэднюю школу. Затым праходзіў марскую службу. У газеце "Кронштадтская правда" апублікаваў артыкул "Катер выполняет задание". Але журналистам ён не стаў. Яго лёс вызначыўся, калі ён паступіў у Гродзенскі сельгасінстытут на факультэт заатэхніі. Пасля яго заканчэння працаваў выкладчыкам біялогіі і асноў сельскагаспадарчай вытворчасці ў Малабераставіцкай сярэдняй школе і завочна вучыўся ў Брэсцкім педінстытуце на прыродазнаўчым факультэце. У 1965 г. Іван Іванавіч стаў аспірантам біялагічнага факультэта БДУ па спецыяльнасці "гідрабіялогія". Асістэнт кафедры заалогіі бесхрыбтовых біяфака Белдзяржуніверсітэта. Адначасова працягваў вучобу ў аспірантуры завочна. Пяць гадоў малады вучоны працаваў старшым лабарантам у заалагічным інстытуце Акадэміі навук БССР, затым – у навукова-даследчым інстытуце ветэрынарыі. У 1975 г. ён абараніў дысертацыю на суісканне вучонай ступені кандыдата біялагічных навук па тэме "Моллюски белорусского Поозерья, их роль в биологической продуктивности озер". У гэтым званні з 1976 па 1993 г. Іван Іванавіч адпрацаваў у Беларускім навукова-даследчым інстытуце рыбнай гаспадаркі навуковым супрацоўнікам. Плённа працаваў загадчыкам лабараторыі ў навукова-вытворчым аб'яднанні "Белрыба". За час сваёй навуковай дзейнасці наш зямляк апублікаваў больш за 50 работ у розных часопісах і зборніках, 15 артыкулаў па гідрабіялогіі, іхтыялогіі і ахове прыроды – у шматлікіх тамах БелСЭ. У 1981 г. удзельнічаў у рабоце III Усесаюзнага з'езда гідрабіялагічнага таварыства СССР у Кіеве, на якім выступіў з дакладам.

## *21 (1940) – 85 гадоў з часу ўтварэння камунальнага вытворчага ўнітарнага прадпрыемства "Свіслацкая сельгазтэхніка"*

Паводле пастановы Савета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б у 1940 г. была арганізаванаСвіслацкая машынна-трактарная станцыя (МТС). Першым дырэктарам яе быў Шаўроў. У канцы 1944 г. станцыя аднавіла работу. Да веснавой сяўбы 1945 г. сабралі два тактары "СХТЗ" і адзін тарктар "Універсал". Не хапала кадраў механізатараў. Каб падрыхтаваць іх, былі арганізаваны курсы Ў МТС, дзе разам з юнакамі займаліся і дзяўчаты. У 1953 г. МТС пераўтворана ў рамонтна-тэхнічную станцыю. У 1958 г. створана рамонтна-тэхнічная меліярацыйная станцыя. У 1961-1962 гг. – раённае аб'яднанне "Сельгастэхніка". У 1978 г. перайменавана ў Свіслацкае раённае вытворчае аб'яднанне па вытворча-тэхнічным забеспячэнні сельскай гаспадаркі, а з 1985 г. – у раённае вытворчае аб'яднанне па вытворча-тэхнічнаму абслугоўванню аграпрамысловага комплексу, у 2001 г. – у ДП "Свіслацкая сельгастэхніка Гродзенскага унітарнага прадпрыемства "Аблсельгастэхніка". У 2009 г. на яго базе адкрыты цэх па вытворчасці паліва з саломы – пелеты, быў зроблены запуск устаноўкі для драбнення і гранулявання "SSGL-1". 4 снежня 2013 года перайменавана ў камунальнае вытворчае ўнітарнае прадпрыемства "Свіслацкая сельгазтэхніка". У 2020 годзе ўзбуйнена шляхам далучэння УСП "Вердамічы".



## *23 (1960) – 65 гадоў з дня нараджэння Каскевіча Віктара Іванавіча, дацэнта, кандыдата фізіка-матэматычных навук*



Нарадзіўся ў в.Новы Двор. У школе аддаваў перавагу матэматыцы, удзельнічаў у раённых і абласных алімпіядах. Быў пераможцам абласной і прызёрам рэспубліканскай матэматычных алімпіяд, у 1977 г. стаў пераможцам конкурсу, абвешчанага часопісам "Квант". Пасля заканчэння Навадворскай сярэдняй школы з залатым медалём паступіў у Ленінградскі дзяржаўны універсітэт на матэматыка-механічны факультэт. З 1982 да 1984 гг. працаваў

асістэнтам кафедры алгебры і функцыянальнага аналізу Гродзенскага ўніверсітэта. У 1984 паступіў у аспірантуру Інстытута матэматыкі Акадэміі навук Беларусі. З 1987 г. – малодшы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. У наступным годзе Віктар Іванавіч абараняе кандыдацкую дысертацыю і атрымлівае вучоную ступень кандыдата фізіка-матэматычных навук. З 1992 г. ён працуе дацэнтам кафедры вышэйшай матэматыкі Беларускай дзяржаўнай палітэхнічнай акадэміі. Наш зямляк удзельнічаў у рабоце журы Рэспубліканскай матэматычнай алімпіяды школьнікаў. З'яўляецца аўтарам задач, якія выкарыстоўваюцца на абласных і рэспубліканскіх алімпіядах. Мае шэраг артыкулаў для школьнікаў алімпіяднага зместу ў часопісе «Фокус». Друкуецца пад прозвішчам Каскевіч або псеўданімам У.Навадворскі. Мае навуковыя публікацыі ў часопісах "Доклады Академии наук БССР", "Вопросы алгебры" і іншых. У 1995 годзе прысвоена вучонае званне дацэнта. З 2007 года дацэнт кафедры вышэйшай алгебры механіка-матэматычнага факультэта БДУ.

## КРАСАВІК

### 4 (1900) – 125 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Гаўрылавіча Шламанава, удзельніка Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў.

Нарадзіўся ў в.Забор'е Віцебскай вобласці. Дзесяцігадовым хлапчуком пачаў сваё працоўнае жыццё. Пасвіў кароў, а потым працаваў у лесе. У 1919 г. прызвалі ў рады Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. Ваяваў пад Псковам, на Заходнім фронце пад Віцебскам, потым у складзе 55-га асобага палка УНК граміў банды Махно і іншых стаўленікаў белагвардзейшчыны на Украіне, Дану, Кубані. Удзельнік разгрому барона Урангеля пад Перакопам. У канцы 1939 г. камуніст А.Г.Шламанаў атрымлівае адказнае даручэнне Цэнтральнага Камітэта КПБ. Ён накіроўваецца ў вызваленыя раёны Заходняй Беларусі, дзе наладжваў новае жыццё, праводзіў выбары ў органы Савецкай улады. Вайна застала яго ў Івянцы, на пасадзе начальніка лесаўчастка "Налібоцкая пушча". Шламанаў спачатку займаў пасаду камісара батальёна на Заходнім фронце, затым палітрука рабочай калоны на



спецбудаўніцтве. У кастрычніку 1942 г. ён прымае цвёрдае рашэнне: піша заяву ў ЦК партыі аб накіраванні яго ў варожы тыл для арганізацыі партызанскага

руху. Просьбу камуніста задаволілі. Група патрыётаў праз Віцебскую браму перапраўляецца пешшу ў тыл праціўніка. Выканаўшы першае заданне, Аляксандр Гаўрылавіч вяртаецца ў Маскву, дзе яго чакала першая баявая ўзнагарода – ордэн Айчыннай вайны II ступені. Нядоўгія тыдні адпачынку і зноў варожы тыл. Партызанская брыгада імя Чапаева. Камісар, сакратар Свіслацкага падпольнага райкама партыі. Двухмесячны марш у Беластоцкую вобласць. Другая ўзнагарода – ордэн Чырвонай Зоркі. У пасляваенныя гады Аляксандр Гаўрылавіч доўгі час працаваў на адказных савецкіх і гаспадарчых пасадах. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Пайшоўшы на пенсію, на працягу дзесяці гадоў узначальвае райсавет добраахвотнага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, працуе ў парткамісіі РК КПБ.

## МАЙ

### 2 (1940) – 85 гадоў з дня нараджэння генерал-маёра Вінцэнтаса-Алльвідаса Вінцэнтавіча Меджуса



Генерал-маёр нарадзіўся ў Літве, з 1992 года – наш зямляк. Жаданне быць афіцэрам прывяло яго ў палкавую артылерыйскую школу. І ўвесь баявы шлях – ад курсанта да генерал-маёра – ён прайшоў з гонарам, верны афіцэрскаму абавязку. Служыў Радзіме, не баючыся ніякіх цяжкасцей, не думаючы аб званнях і ўзнагародах. Першым у Савецкай Арміі атрымаць на ўзбраенне рэактыўныя сістэмы залпавага агню “Ураган” і паспяхова іх выпрабаваць – такога ганарлівага права ў 1977 годзе быў удастоены менавіта рэактыўны артылерыйскі полк пад камандаваннем Вінцэнтаса Меджуса. Меджус – Ганаровы салдат 1-й рэактыўнай артылерыйскай батарэі палка “Ураган” г. Брэста (першы, хто удастоены гонару насіць гэта званне). У адстаўцы генерал-маёр з натхненнем удзельнічаў у грамадзянска-патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Ён умеў знайсці патрэбныя словы, тыя, якімі камандзіры натхняюць моладзь на подзвігі, вучаць берагчы мір, любіць сваю Радзіму і быць гатовымі ўстаць на яе абарону. Вінцэнтас Меджус узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, “За службу Родине в Вооруженных Силах СССР” II і III ступеняў, “Знак Пашаны”, медалямі “За боевые заслуги”, “За воинскую доблесть”, юбілейнымі медалямі у гонар Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гадоў. У 2016 годзе па рашэнні Рэспубліканскага Савета грамадскага аб’яднання “Беларускі саюз афіцэраў” узнагароджаны нагрудным знакам “За активную работу”.

### *13 (1950) – 75 гадоў з дня нараджэння Курачкіна Юрыя Андрэявіча, доктара фізіка-матэматычных навук (1998)*



Нарадзіўся ў г.п.Свіслач. Скончыў у 1971 г. Гродзенскі педагагічны інстытут, затым працаваў у Інстытуце фізікі НАН Беларусі. Прапанаваў новы метад рашэння задач рэлятывісцкай кінематыкі, заснаваны на сувязі алгарытмаў кватэрніёнаў і біркватэрніёнаў з геаметрыяй прастораў Лабачэўскага. Разам з іншымі даў тлумачэнне прыроды выраджэння спектраў энергій задач Кеплера ў прасторах пастаяннай крывізны. Актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці, узначальваю Беларускае фізічнае таварыства, 13 гадоў быў старшынёй прафкама Інстытута фізікі.

## *ЧЭРВЕНЬ*

### *(1945) – 80 гадоў з дня нараджэння Івана Ламашкевіча, свіслацкага паэта*



Нарадзіўся ў в.Грынкі Свіслацкага раёна. Пачаў пісаць у школьныя гады спачатку прозу ў мясцовую газету, затым вершы для сябе. Для душы, марыў стаць журналістам. Адпрацаваў 25 гадоў у тралейбусным парку № 2, спяваў у Народнай харавой капэле Палаца Культуры трактарнага завода. З 2006 года з'яўляецца ўдзельнікам літаратурнага аб'яднання "Натхненне" пры Рэспубліканскім Доме ветэранаў у г.Мінску. Друкаваўся ў зборніках клуба "И снова душу греет благодать", "Святло дабрыні", "Ад зямлі да нябёсаў", "І гаспода мая, і мой храм", у альманаху "Гоман". У 2014 годзе на конкурсе маладых выканаўцаў песня "Белая Русь" на вершы І.Ламашкевіча атрымала дыплом І ступені. Яго гумарэскі неаднаразова гучалі на аглядзе мастацкай самадзейнасці трактарнага завода "Пой, Беларусь" і былі адзначаны дыпломамі.На пенсіі жыў у Свіслачы. Яго вершы друкаваліся на старонках "Свіслацкай газеты". Памёр Іван Канстанцінавіч 25 сакавіка 2023 года.

## *1 (14) (1900) – 125 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Забэйды-Суміцкага, опернага спевака*



Нарадзіўся ў в.Несцеравічы Свіслацкай воласці. Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1918), Харбінскі ўніверсітэт (1929). Выдатна спяваў з дзяцінства. Песня стала справай яго жыцця. З дзяцінства ён спяваў у школьным хоры салістам. Рана навучыўся іграць на балалайцы і міндаліне, гітары і скрыпцы. У Харбіне яго настаўніцай стала прафесар Ю. Плотніцкая, у мінулым партнёрша слыннага Ф. Шаляпіна. Дэбют Забэйды-Суміцкага адбыўся ў Харбінскай оперы. Пачатак на сцэне харбінскай опернай трупы ў ролі Ленскага атрымаўся не проста ўдалы – ашаламляльны! На наступны дзень харбінская прэса ўзносіла да нябёс маладога артыста, адзначаючы, што той перасягнуў усе спадзяванні. Але Міхась добра разумеў, што яшчэ не дасягнуў вышынь выканаўчага майстэрства. Па гэтай прычыне спявак аказаўся ў Мілане. Вучоба і праца тут праходзілі ўдала. Гады ў Італіі адзначаны вялікімі поспехамі ў артыстычнай кар’еры Забэйды-Суміцкага. Калыханка, якую праспявала Міхасю маці ў дзяцінстве, прайшла са спеваком праз усё жыццё, праз усе ягоныя канцэртныя праграмы, стаўшы візітнай карткай. На сезон 1935–1936 гг. Міхаіл Іванавіч заключыў кантракт з Пазнанскім оперным тэатрам. Затым пераехаў у Варшаву, дзе выступаў у канцэртах па радыё. Акрамя вядомых класічных твораў у яго рэпертуары былі беларускія народныя песні. Ён стаў адным з першых выканаўцаў, хто вынес наш песенны фальклор на сусветныя сцэнічныя падмосткі. 13 снежня 1936 г. у Вільні святкавалі Дзень беларускай культуры. Яго арганізатарамі былі М. Танк, М. Машара, Р. Шырма, мастак П. Сергіевіч. На святочным канцэрце спяваў Міхаіл Забэйда-Суміцкі. Мясцовая прэса пісала, што такога трыумфу даўно не бачыла канцэртная зала ў Вільні. У 1939 г. спявак быў запрошаны ў турнэ па Еўропе, а затым і па Амерыцы. Планы раптоўна парушыла вайна. Яна застала Міхася ў Варшаве. Адтуль у 1940-м ён пераехаў у Прагу. Неаднойчы наведваў з канцртнымі запрашэннямі Беларусь, тройчы быў у Мінску. Ён быў перакананы, што «песня рабіла сваё, яна абуджала ў людзях найлепшыя пачуцці, прабуджала волю да барацьбы за вызваленне ад акупантаў». Захаваліся сведчанні ўдзельнікаў партызанскага руху, паводле якіх артыст свае ганарары ад канцэртаў перадаваў партызанам на медыкаменты і іншыя патрэбы. У 1943 г. выступаў з канцэртам у Ваўкавыску. Намаганнямі дзеячаў беларускай культуры ў 1963 г. адбыліся гастролі Міхася Забэйды-Суміцкага на Бацькаўшчыне. Памёр Міхась Забэйда-Суміцкі 21 снежня 1981 года. Пад час развітання з артыстам як рэквіем гучала тая самая, вядомая ўжо тысячам слухачоў, матчына калыханка.

**18 (1950) – 75 гадоў з дня нараджэння Валянціна Васільевіча Акудовіча, пісьменніка**



Нарадзіўся ў Свіслачы. У 1980 г. скончыў Маскоўскі літаратурны інстытут імя М.Горкага пры Саюзе пісьменнікаў СССР. Працаваў у штотыднёвіку "Культура", у часопісе "Крыніца" загадчыкам аддзела філасофіі і замежнай літаратуры, намеснікам галоўнага рэдактара філасофскага часопіса "Фрагменты". Аўтар кніг "Мяне няма. Роздумы на руінах чалавека" (1998) і "Разбурыць Парыж" (2003). У розныя гады быў лаўрэатам літаратурных прэмій штотыднёвіка "ЛіМ", часопіса "Крыніца", Беларускага гуманітарнага цэнтра і прэміі імя Алеся Адамовіча. Эсэ "Горад, якога няма" упершыню было апублікаванае ў газеце "Культура" у літаратурна-філасофскім сшытку "ЗНО" 26 студзеня 1994 года.

## ЛІПЕНЬ

**17 (2020) – 5 гадоў назад адкрыта міні-футбольная пляцоўка з ненатуральным пакрыццём на базе СШ №2 імя М.П.Масонава г. Свіслачы**



## ЖНІВЕНЬ



**15 (2020) – 5 гадоў назад у гарадскім парку імя В.Тышкевіча урачыста была адкрыта дзіцячая пляцоўка**

## 29 (2015) – 10 гадоў назад адчынены сквер “Ад мінулага да сучаснасці” у Свіслачы

У рамках святочных мерапрыемстваў трэцяга Свіслацкага кірмашу быў адкрыты сквер “Ад мінулага да сучаснасці”. Зрабіў гэта старшыня райвыканкама У. С. Анішчык у прысутнасці графа і графіні Тышкевічаў. Усе пачулі цікавы расказ прыгажуні Німфы аб паходжанні Свіслачы, а таксама змаглі асабіста пераканацца ў тым, што легенда ўсё ж існавала, ды і ўзнікла вельмі даўно. А цяпер яна застыла ў драўляных скульптурах-вобразах. Вось стаіць старац. Ён уважліва глядзіць на Ізяслава і Багумілу. Трохі паводдаль – народ. Тут жа мудрая сава, зубр-асілак і вялізны камень з адбіткам далоні яцвяжскага бога. Дапаўняе гэтую карціну прыгожая панарама Белавежскай пушчы, па-майстэрску створаная мясцовымі мастакамі. Гэта своеасаблівая фотазона, дзе жадаючыя робяць фотаздымкі на памяць. Прываблівае ў скверы лаўка прымірэння, дзе прахожыя прысаджваюцца, размаўляюць, адпачываюць.



# КАСТРЫЧНІК

## Кастрычнік (1965) – 60 гадоў з дня стварэння Свіслацкага філіяла ДП “Гроднааблпаліва”

У яго падначаленні да 1973 года знаходзіўся і Бераставіцкі раён. Да 1965 года абслугоўваннем раёна займаўся Ваўкавыскі гарпалівазбыт. Першыя крокі прадпрыемства былі складанымі: штат – 10 чалавек, поўная адсутнасць тэхнікі і базы. Адзіны трактар МТЗ-80 не спраўляўся з задавальненнем усіх заявак. Паліва дастаўлялі спажыўцам наёмным транспартам. Пляцоўку для захоўвання дроў і вугалю даводзілася арандаваць у чыгуначнай станцыі Свіслач. Першымі кіраўнікамі былі М.М.Кардаш, М.А.Пачэбут. З 1976 да 1999 г. узначальваў прадпрыемстваЛ.І.Клябанаў, да 2004 г. – А.М.Мілько, з 2004 г. – Г.С.Жалоба, у цяперашні час – В.І.Шыманіца.



## 9 (2020) – 5 гадоў з дня адкрыцця Музея культуры і творчасці

У 2020 годзе ў Грынкаўскім сектары культуры і вольнага часу размясціўся музей культуры і творчасці. У ліку першых наведвальнікаў – старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр Вярсоцкі, старшыня Свіслацкага раённага Савета дэпутатаў Віктар Суботка, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Ірына




Паўлючэня, кіраўнікі ўстаноў культуры раёна, творчых калектываў, ветэраны культуры. У ролі першага экскурсавода выступіла Надзея Карпюк, якой і належыць ідэя стварэння музея. За плячыма гэтай ініцыятыўнай і энергічнай ветэранкі працы ляжыць сапраўды вялікі пласт плёну. Тут у адным месцы сабрана культурная памяць раёна. Гэта храм памяці аб людзях, што ў розныя гады працавалі ў культуры, іх справах і дасягненнях.

# ЛІСТАПАД

## 4 (1860) – 165 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Адольфа Здзіслававіча Бітнера, хірурга, доктара медыцыны

У 1884 г. скончыў Варшаўскі універсітэт і прыехаў у Свіслач, дзе пачаў лекарскую практыку. У 1893 г. ажаніўся з сястрой бяздзетнага ўладальніка маёнтка Кватары Клемянціна Гліндзіча. Другі маёнтак у яго быў на Навагрудчыне. У Свіслачы Бітнер адпрацаваў 14 год. Ён цікавіўся хірургіяй і акулістыкай, амаль штогод ездзіў за мяжу, каб дасканаліць сваю кваліфікацыю. Стаўшы гаспадаром Кватарскага маёнтка, доктар заснаваў тут на ўласныя сродкі лячэбніцу і лячыў у асноўным люд навакольных вёсак, прычым бедных – бясплатна. Не спыняў практыкі і ў Свіслачы. Аб ім казалі, што гэта быў чалавек гуманны, добры. А.Бітнер быў актыўным грамадскім дзеячам. У 1919 г. ён прапанаваў заснаваць у Кватарах лакальную сельскагаспадарчую школу, дзеля чаго выдзеліў 10 дзесяцін зямлі. Пасля яго смерці вуліцу ў Свіслачы, што ішла ў накірунку да Кватараў перайменавалі ў вуліцу Бітнера. На каталіцкіх



могілках у Свіслачы ўстаноўлены помнік з чырвонага граніту з надпісам: "Святой памяці Адольф Бітнер, доктар медыцыны. Жыў 63 гады. Памёр 18 студзеня 1924 года. Служыў чалавецтву і Богу". У 1996 г. у Свіслачы на вуліцы Камсамольскай на адным з будынкаў усталявана мемарыяльная дошка ў гонар Бітнера.

## 6 (1930) – 95 гадоў з дня нараджэння Алы Рыгораўны Даманавай, кандыдата медыцынскіх навук



Урач-акушэр-гінеколага І катэгорыі, выдатнік аховы здароўя СССР, кандыдат медыцынскіх навук, кавалер ордэна Леніна і "Знак Пашаны", Ганаровы донар СССР. Ала Рыгораўна нарадзілася ў г.Мінск у сям'і служачых. У 1949 г. паступіла ў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут. У 1955 г., атрымаўшы дыплом урача з адзнакай, яна адпраўляецца на сваё першае працоўнае месца – у Свіслацкую раённую бальніцу. Усю сваю працоўную дзейнасць Ала Рыгораўна прысвяціла акушэрству і гінекалогіі. Яна загадвала акушэрска-гінекалагічным аддзяленнем, адначасова з'яўлялася раённым спецыялістам і арганізатарам усёй акушэрска-гінекалагічнай дапамогі на Свіслаччыне. Менавіта тады раскрыўся яе талент арганізатара і кіраўніка. Усе свае веды, велізарную энергію і працавітасць, якія былі ёй уласцівыя, Ала Рыгораўна аддавала любімай працы і хворым. Працаваць прыходзілася шмат: і амбулаторны прыём весці, і загадваць радзільным аддзяленнем, і аказваць практычную дапамогу акушэрам радзільных дамоў пры сельскіх ФАПах, і ажыццяўляць прафілактычную работу сярод насельніцтва. Транспарту ў яе распараджэнні не было. Да хворых і рожаніц дабіралася на лыжах, кані, а часцей – пешшу. Тысячы нованароджаных свіслачан прынялі яе ласкавыя рукі. Не менш на яе рахунку і аператыўных умяшанняў. У 1965 г. у Свіслацкім раёне ўпершыню сярод сельскіх раёнаў БССР па ініцыятыве Алы Рыгораўны родадапамога цэнтралізавана на радзільныя койкі раённай бальніцы. З'явілася магчымасць арганізаваць службу анестэзіялогіі і рэанімацыі на базе радзільнага аддзялення. З 1962 года ў раёне не рэгістравалася мацярынская смяротнасць, не было выпадкаў эклампсіі. Перынатальная смяротнасць знізілася ў чатыры разы. Вынікі яе разважанняў, назіранняў, практычныя навыкі і сталі пасля вынікам кандыдацкай дысертацыі "Цяжарнасць і роды ў сельскіх жыхарак", якую Ала Рыгораўна паспяхова абараніла ў 1974 годзе. Ёю быў праведзены аналіз 11627 гісторый родаў з 1950 па 1971 год і доказана эфектыўнасць цэнтралізацыі родадапамогі на вёсцы. Кандыдату медыцынскіх навук прапанавалі выкладчыцкую працу ў ВНУ, але яна адмовілася і вярнулася працаваць у Свіслацкі раён. Яе шматгадовая і добрасумленная работа на ніве аховы здароўя насельніцтва адзначана юбілейным медалём "За доблестный труд. В ознаменование 100-летия со дня

рождения Ленина”, медалямі “Ветеран труда”, “Лучший наставник молодежи”, “Победитель соцсоревнований”, значкамі “Лучший пропагандист донорства”, “Отличник санитарной обороны СССР”, “Ударник коммунистического труда”.

## 13 (1960) – 65 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Міхайлавіча Грунтовіча, кандыдата фізіка-матэматычных навук

Нарадзіўся ў в.Новы Двор. Пасля заканчэння Навадворскай сярэдняй школы паступіў у Ленінградскі ордэна Леніна і ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А.Жданава. У 1985 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па тэме “Структурные вопросы теории простых алгебр над полем” и атрымаў званне кандыдата фізіка-матэматычных навук. Яго працы друкаваліся ў шматлікіх савецкіх і ўсерасійскіх зборніках. Напрыклад, у зборніку навуковых прац “Кольца и матричные группы”, выдадзеным Паўночна-Асецінскім дзяржаўным універсітэтам імя К.Л.Хетагурава ў г.Арджанікідзэ ў 1984 г., надрукаваны артыкул Міхаіла Міхайлавіча “О группе Брауэра поля функций вещественной алгебраической кривой”. Працаваў у Пензенскім навукова-даследчым электратэхнічным інстытуце (1986–1996), Таварыстве з абмежаванай адказнасцю Пензенскае навукова-даследчае прадпрыемства “Стал” (1996–2000), Навукова-вытворчай фірме “Крышталь” (2000–2008), Пензенскім дзяржаўным універсітэце (1997–2018), кіраўнік аддзела праектавання і распрацоўкі праграмна-апаратных сродкаў абароны інфармацыі, адначасова з 2014 г. – у Маскоўскім фізіка-тэхнічным інстытуце, дацэнт кафедры абароны інфармацыі.

## 14 (1905 г.) – 120 гадоў з дня нараджэння Масонава Мікалая Паўлавіча, палкоўніка, Героя Савецкага Саюза

Нарадзіўся ў пасёлку Васільсурск, цяпер пасёлак гарадскога тыпу Варатынскага раёна Горкаўскай вобласці, у сям’і рабочага. У Савецкай Арміі з 1926 года. У 1929 годзе скончыў Разанскую пяхотную школу. У 1931 – курсы “Выстрал”. На франтах Вялікай Айчыннай вайны з ліпеня 1941 года. Камандзір 217-й стралковай дывізіі (48 армія 1-ы Беларускі фронт). Вялікая Айчынная вайна застала М.П.Масонава пад Оршай. На той час ён быў у званні маёра і камандаваў 602-м матастралковым полкам. За баі пад Оршай, мужнасць і ўмелае камандаванне войскамі Мікалай Паўлавіч быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У жніўні 1943 года Масонава прызначаюць камандзірам 217-й стралковай дывізіі і прысвойваюць званне палкоўніка. Масонаў у баях 24 чэрвеня – 3 ліпеня



1944 г. умела кіраваў баявымі дзеяннямі часцей дывізіі па прарыву абароны праціўніка ў Рагачэўскім раёне Гомельскай вобласці і фарсіраванню ракі Беразіны. Прымаў удзел у вызваленні гарадоў Бабруйск, Баранавічы. Узначальваючы 217-ю стралковую Унечскую Ордэнаў Леніна, Чырвонага Сцяга и Суворава другой ступені дывізіі Масонаў з перамогай дайшоў да нашай Свіслачы. Тут на Свіслаччыне М.П.Масонаў геройскі загінуў у барацьбе з фашыстамі ў дзень вызвалення пасёлка 17 ліпеня 1944 года і пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан. 23 жніўня 1944 года М.П.Масонаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна. Маці Мікалая Масонава асабіста ўручыў грамату аб прысваенні яе сыну звання Героя Савецкага Саюза савецкі ваенны лётчык, Герой Савецкага Саюза Аляксей Марэсьеў. Імя Мікалая Паўлавіча Масонава залатымі літарамі напісана на помніку ў цэнтры Свіслачы. Яго імя носіць адна з вуліц горада і сярэдняя школа № 2, на будынку якой усталявана мемарыяльная дошка. У 2004 г. у г.Свіслач на месцы гібелі Мікалая Паўлавіча быў адкрыты памятны знак. У 2023 г. быў адкрыты помнік-бюст Герою Савецкага Саюза палкоўніку Мікалаю Масонаву.

## СНЕЖАНЬ

### *Пачатак снежня (2005) – 20 гадоў вакальнаму калектыву "Спадчына" Грынкаўскага сектара культуры і вольнага часу*

У ўдзельнікаў калектыву жыццё саткана з любові да роднай песні, да нашай беларускай, да той, якую любілі матулі і татулі. Бацькі амаль усіх вызначаліся добрымі галасамі, музычныя інструменты – гармонь, скрыпка – былі на пачэсным месцы ў хатах. Часам на вяселлях і радзінах спявалі цэлымі сем'ямі. Таму і рэпертуар слыннага калектыву складаюць у першую чаргу такія песні, ад якіх быў у захапленні вядомы фалькларыст Рыгор Шырма. Ён, як зачараваны, слухаў галасы грынкаўскіх дзяўчат пад час вандроўкі па Свіслаччыне ў 1936 годзе. Вось адкуль карані, вось адкуль гэта любоў і пяшчота: "Зялёны лісце, белы каштаны", "Пасажу каліну ў полі", "Як у вішнёвым у садочку", "Ты, чырвоная каліна" і шмат-шмат іншых. 20 гадоў таму Людміла Георгіеўна Лукша, былы дырэктар Дома культуры, патэлефанавала з прапановай сабрацца, каб пагаманіць ды песні паспяваць. Адгукнуліся актыўна, бо ў кожнай з гэтых прыгожых вясковых кабет ужо быў вопыт сцэны, а ў памяці – мерапрыемствы, рэпетыцыі, канцэрты… І паліліся песні! Канцэртаў – не пералічыць: для сваіх вясковых гледачоў, амаль ва ўсіх клубных установах раёна, для жыхароў



Ваўкавыскага, Шчучынскага, Зэльвенскага раёнаў, на абласным фестывалі ветэранскіх калектываў “Не старэюць душой ветэраны” у горадзе Ваўкавыску. Ва ўсіх клубных святах і мерапрыемствах яны – першыя, бо, як спяваюць дзяўчаты, “сядзець дома надаела, вечна штосьці прыбіраць”. Іх выступленні заўсёды з’яўляюцца “разыначкай” у цікавых клубных праектах – ці гэта кулінарны парад “У кожну хату – смачна есці!”, ці свята “Грынкі збіраюць сяброў”, ці паэтычны праект “Песняй і вершам мы вёску ўслаўляем”. З інтэрактыўнай выставай “Мода з камода” трапілі на рэспубліканскае тэлебачанне. Усе ўдзельніцы калектыву вельмі розныя па характару, па адносінах да жыцця, па сваіх творчых магчымасцях, але іх яднае адно – адданасць: адданасць і калектыву, да якога прыраслі і душой, і каранямі, і адданасць нашай беларускай культуры.

## 14 (2000) – 25 гадоў назад Свіслач атрымала статус горада раённага падпарадкавання



Нацыянальным кадастравым агенцтвам Дзяржаўнага камітэту па зямельных рэсурсах геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь зарэгістравана рашэнне Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў № 44 ад 14.12.2000 г. аб аднясенні гарадскога пасёлка Свіслач да катэгорыі гарадоў раённага падпарадкавання. Рэгістрацыя праведзена 22 снежня 2000 года.

## 18 (2020) – 5 гадоў назад сімвалічнай закладкай каменя дадзены старт будаўніцтву дрэваапрацоўчага завода, якое запусціла аўстрыйская кампанія ТАА "ЭйчЭс Белакон".



Традыцыя падрыхтоўкі да закладкі першага каменя носіць не толькі сімвалічны характар, але мае практычны сэнс – разам з каменем у спецыяльнай капсуле часу адпраўлена пасланне ў будучыню для нашых нашчадкаў. Свіслач як пляцоўка для будаўніцтва дрэваапрацоўчага прадпрыемства выбрана па шэрагу прычын. Па-першае, гэта ідэальнае месца з пункту гледжання лагістыкі. Па-другое, развіццё лясной гаспадаркі тут з’яўляецца ўстойлівым. Па-трэцяе, добра развіта інфраструктура, што робіць свабодную эканамічную зону асабліва прывабнай.

Краязнаўчы каляндар знамянальных і памятных дат на 2025 год


складальнік А.У. Рабчанка

рэдактар Н.У.Калач